**Фёдар КЛІМЧУК**

# НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ ПРАБЛЕМЫ УРАІНСКАГА ЭТНА- І ГЛОТАГЕНЕЗУ

*Гутарка пойдзе пра паходжання ўкраінскага этнаса і яго мовы. Менавіта пра этнас, а не нацыю ці народнасць. Нацыя – з'ява новая. Паняцце «нацыя» разумеюць па-рознаму. У адных выпадках гэтае паняцце набліжаецца да паняцця «этнас», у другіх – атаясамліваецца з паняццем «грамадзянства» і г.д.*

***Ключові слова:*** *этна- і глотагенез, этнас, нацыя, украінская мова.*

Існуюць розныя погляды на значэнне паняцця «народнасць». У навуковай літаратуры і ў палітыцы вялікае значэнне надаецца перапісам насельніцтва. Між тым, у перапісах мноства ўсялякіх хібаў [21, с. 92–106 ].

Этнас жа – з'ява трывалая і старажытная. Яна незалежная ад палітычнай прыналежнасці, самасвядомасці, рэлігіі і іншых падобных фактараў. Этнасы існавалі яшчэ ў часы першабытна-абшчыннага ладу, існуюць і будуць існаваць. У прыватнасці, агульнапрынята лічыць, што яшчэ ў першабытную эпоху ўзніклі індаеўрапейцы, германцы, індаарыйцы, балты, італікі, кельты, фіны, цюркі і г.д. Паняцце «этнас» уключае і нацыю, і народнасць, і групу старажытных роднасных плямёнаў. Этнасу характэрна адносная агульнасць мовы (роднасных гаворак), духоўнай і матэрыяльнай культуры, менталітэту і інш.

Этнас і мова. Звычайна арэалы рассялення пэўнага этнасу і пашырэння яго мовы блізкія. Выключэнні, вядома, бываюць. Але ў агульным плане гэта прынцыпова не мяняе становішча. Таму калі разглядаць пытанне пра вытокі ўкраінскага этнасу ці ранняга ўкраінскага этнагенезу, мы ў нейкай меры адначасова закранаем пытанне ўкраінскага глотагенезу або вытокаў украінскай мовы.

Дзве ўкраінскія зоны. Ва Ўкраіне выразна выдзяляюцца дзве зоны: цэнтральна-заходняя і паўднёва-ўсходняя. На тэрыторыі цэнтральна-заходняй зоны на працягу тысячагоддзяў пераважна жыло адно і тое ж насельніцтва, тут адбывалася фарміраванне ўкраінскага этнасу. Тут гэты этнас склаўся і захаваўся. На тэрыторыі паўднёва-ўсходняй зоны насельніцтва неаднаразова

**© Клімчук Ф., 2015.**

мянялася. Сярод іншых народаў тут пасяляліся і славяне. Час ад часу іх пасяленні дасягалі Чорнага і Азоўскага мораў. Час ад часу яны адсюль выцясняліся, пераважна на поўнач, паўночны захад і захад. Канчатковае засяленне і дазасяленне гэтай тэрыторыі ўкраінцамі адбылося ў XV – пачатку XIX стст.

Для ўтварэння пэўнага этнасу неабходны пэўныя ўмовы.

1. Кансалідацыя насельніцтва на пэўнай тэрыторыі. Гэта можа быць у межах дзяржавы, а ў дадзяржаўны перыяд – у межах этна-культурнай агульнасці (археалагічнай культуры).

2. Аддзяленне ад суседніх роднасных этнасаў дзяржаўнымі межамі, а ў дадзяржаўны перыяд межамі этна-культурных агульнасцей (археалагічных культур).

3. Працягласць гэтага працэсу.

Пры даследаванні для сучаснага этнасу неабходна выявіць гістарычны эквівалент.

Вынікам адзначаных умоў з’явілася ўтварэнне ў старадаўнім славянскім кантынууме дыялектных зон [88, с. 3–14].

Украінцы не маглі скласціся як этнас у той час, калі (пра)ўкраінская этнічная тэрыторыя ўваходзіла ў склад розных дзяржаў. А гэта апошнія 8–9 стагоддзяў. Пачалася гэтая эпоха ў XI–XII стст., а скончылася ў 1939–1945 гг. У XI–XII–XX стст. украінцы (і праўкраінцы) жылі ў розных дзяржавах. Значыць, не можа быць і мовы, каб у гэты час украінскі этнас выдзеліўся са славянскага ці ўсходнеславянскага свету і кансалідаваўся ў асобную народнасць.

XI–XIII стст. – гэта эпоха старажытнарускіх княстваў, якія ўяўлялі сабою асобныя дзяржавы. І ў гэты час таксама адсутнічаюць умовы для выдзялення і кансалідацыі як (пра)ўкраінцаў, так і (пра)беларусаў. Часам існавалі тэндэнцыі аб’яднання заходне- ці паўднёвастаражытнарускіх княстваў. Але гэта сведчыць толькі аб этнічнай блізкасці іх насельніцтва, якая склалася раней.

Старажытнарускім княствам папярэднічае эпоха Кіеўскай Русі. У гэтую эпоху існавалі ўмовы для кансалідацыі насельніцтва на тэрыторыі сучаснай Украіны, але адсутнічалі ўмовы для адасаблення праўкраінцаў ад прабеларусаў і паўднёвых прарасіян.

Адсюль вынікае, што ў эпоху Кіеўскай Русі як этнічная адзінка праўкраінцы існавалі.

Рэтраспектыўна перамяшчаемся ў папярэднюю эпоху, г.зн тыя часы, якія папярэднічалі Кіеўскай Русі [7; 20, с. 8–10; 22, с. 21–23; 25, с. 47–54; 26, с.162–180; 29, с. 100–148; 33, с. 27; 71; 73; 74], паколькі, як мы вызначылі вышэй, у часы Кіеўскай Русі (пра)беларускі і (пра)ўкраінскі этнасы ўжо існавалі. Існавалі яны і пазней. З гэтага вынікае, што ўзніклі гэтыя этнасы да часоў Кіеўскай Русі.

У канцы VII – X стст. існуе культура Лукі Райкавецкай [2, с. 376; 73, с. 46–185; 76, с. 255–266, 302–362]. Яна займае тэрыторыю Правабярэжнай і Заходняй Украіны, часткі Левабярэжнай Украіны (Палтаўшчыну), сумежныя рэгіёны суседніх дзяржаў. Як бачым, гэта пераважная частка той тэрыторыі, якую цяпер у арэале рассялення ўкраінцаў называюць зонай старога засялення.

Культура Лукі Райкавецкай мела свае перыферыі. Да іх, у прыватнасці, адносіцца Тураўшчына, якая прыблізна з рубяжа VIII–IX стст. раздзяляе лёс Цэнтральнай Беларусі і нават становіцца цэнтрам племені дрыгавічоў [36, с. 78–82]. Насельніцтва Тураўшчыны не ўвайшло ў склад украінскага этнасу.

Чарнігаўшчына і (сумежныя вобласці) была заселена севяранамі. Іх культура мела пераходны характар паміж культурамі Лукі Райкавецкай, племені радзімічаў і племені вяцічаў. Але ўжо з IX ст. асноўная тэрыторыя севяран, уключаючы Чарнігаў, увайшла ў арбіту ўплываў Кіева. Акрамя таго мелі месца перасяленні з Цэнтральнай Украіны на Чарнігаўшчыну ў часы Кіеўскай Русі [75]. Праўда, яшчэ да сярэдзіны XVII ст. сеўрукі выступаюць як даволі абасобленая ўсходнеславянская этнічная еднасць.

Такім чынам, з канца VII і да рябяжа – IX–X стст. мы ўпершыню сутыкнуліся с такой сітуацыяй, калі асноўная тэрыторыя, заселеная праўкраінцамі, ўяўляла сабою этна-культурнае адзінства і была адасоблена ад суседніх усходнеславянскіх абласцей. Гэтым самым выяўлены <u>гістарычны эквівалент</u> для сучаснага ўкраінскана этнасу. <u>Тэрыторыя культуры Лукі Райкавецкай – гэта старадаўняя ўсходнеславянская зона, насельніцтву якой належыць вялікая роля ў этнагенезе ўкраінцаў</u>. Але фарміраванне гэтай зоны з’яўляецца вынікам этнічнай гісторыі папярэдніх эпох. Правабярэжнаўкраінская этна-культурная зона ў мінулім,

відаць, займала вузейшую тэрыторыю і ахоплівала толькі лесастэпавую яе частку. Яе фарміраванне хутчэй за ўсё пачалося ў тыя часы, калі праслявяне яшчэ канчаткова не выдзеліліся з агульнаіндаеўрапейскай агульнасці. У III тыс. да н.э. паўднёвая частка гэтай зоны была рэгіёнам кантактаў нашчадкаў «трыпольцаў» з іншымі індаеўрапейцамі («шаравікамі» і іншымі).

Мова. Мова – адзін з асноўных «атрыбутаў» этнасу. У асяроддзі ўкраінскага этнасу былі ці з’яўляліся ўжывальнымі ў асноўным наступныя моўныя сістэмы: народная вусная мова, як сістэма гаворак, сучасная або новая ўкраінская літаратурная мова, стараўкраінская мова, старажытнаруская пісьмовая мова, царкоўнаславянская мова.

Царкоўнаславянская мова прыйшла на Русь з Паўднёвай Славіі. У некаторых творах, перапісаных ці напісаных царкоўнаславянскай мовай на Русі, сустракаюцца своеасаблівыя «ўкраінізмы». Іх няшмат. Але яны маюць пэўнае значэнне для даследаванняў гісторыі ўкраінскай мовы.

Старажытнаруская кніжная мова X–XIII стст. складалася з двух кампанентаў – царкоўнаславянскага і ўсходнеславянскага. А ва ўсходнеславянскім кампаненце, у частцы помнікаў, у наяўнасці кампанент (пра)ўкраінскі. Старажытнаруская пісьмовая мова не адзіная. У ёй выдзяляюцца варыянты паўднёвы і наўгародскі. Старажытнанаўгародскі дыялект, прадстаўлены берасцянымі граматамі, некаторыя даследчыкі лічаць асобнай мовай. Можна яшчэ гаварыць і пра беларускі варыянт старажытнарускай кніжнай мовы, да якога ёсць падставы аднесці полацка-смаленскія граматы XIII–XIV стст.

Стараўкраінская кніжная мова (XIV–XVIII стст.) складалася з двух асноўных кампанентаў – кніжнага старажытнарускага і ўкраінскага народна-дыялектнага.

Сучасная або новая літаратурная ўкраінская мова сфарміравалася ў канцы XIX – першай палове XIX стст. (І. П. Катлярэўскі, Т. Г. Шаўчэнка і інш.). Сфарміравалася на народна-дыялектнай аснове. Першыя творы на адзінай (не шматкампанентнай) украінскай дыялектнай аснове зафіксаваны ці створаны ў канцы XVI ст. Гэта песня «Dunaju, Dunaju, čemu smuten tečeš?» (1571 г.) і верш І. Жураўніцкага «Хто йдеш мимо» (1575 г.) [15]. На такой моўнай сістэме створана пэўная колькасць твораў у XVII–XVIII стст. [11; 16; 94]. Гэта ўжо

фіксацыя народнай мовы ўкраінскага этнасу, той мовы, якая дажыла да сучаснасці. Таму не маглі ўкраінцы выдзеліцца як асобны этнасы у XVI–XXI стст.

Такім чынам, прыведзеныя моўна-дыялектныя сістэмы падзяляюцца на дзве групы. Першая: украінскія дыялекты як сістэма гаворак і сучасная ўкраінская літаратурная мова. Другая: мовы стараўкраінская, кніжная старажытнаруская (не ўсе помнікі), царкоўнаславянская (асобныя помнікі). Мова помнікаў другой группы складаецца з двух або большай колькасці кампанентаў. Адзін з гэтых кампанентаў – украінскі.

Як бачым, самыя раннія ўзоры украінскай мовы (або ўкраінска-беларускія ці ўкраінска-буларуска-рускія формы) адносяцца да X ст. н.э. А ці можна заглыбіцца ў больш раннія часы? Выяўляецца, што можна. І ўжо ёсць пэўныя напрацоўкі.

(Пра)славяне. Украінскі этнас адносіцца да славянскіх этнасаў. Ён узыходзіць да праславянскага этнасу. Ва ўкраінскім этнасе, як і ў іншых славянскіх этнасах, захаваўся стрыжань праславянскі. (Пра)ўкраінскі этнас выдзеліўся з этнасу праславянскага не як якая-небудзь абсалютная агульнасць-маналіт. (Пра)ўкраінскі этнас атрымаў у спадчыну ад этнасу праславянскага не толькі ўласна моўны элемент, але і лінгвагеаграфічны.

Падзел славянства на ўсходнюю, заходнюю і паўднёвую падгрупы некалькі ўмоўны. Як паказвае Агульнаславянскі лінгвістычны атлас і іншыя крыніцы, у славянскім моўна-дыялектным кантынуўме існуе багата рыс, якія ўтвараюць зоны, што перакрываюць славянскія мовы і дыялекты.

М.В. Нікончук, працуючы над доктарскай дысертацыяй, сабраў у Правабярэжным украінскім Палессі і яго наваколлях багаты лексічны матэрыял [59, 60, с. 153–173; 61; 62]. У ім выявіў праславянскі кампанент і даўнія запазычанні. Частка лексем гэтых тыпаў утварае 18 замкнёных пучкоў ізаглос [60, с. 161]. На думку М. В. Нікончука, гэтыя пучкі акрэсліваюць арэалы старажытных малых плямёнаў.

Г. П. Піўтарак вызначыў шэраг асаблівасцей, якія былі характэрны для розных перыядаў праславянскай мовы [63].

Расійскі вучоны С. Л. Нікалаеў на акцэнталагічным і фанетычным праславянскім матэрыяле, выяўленым у сучасных гаворках, вызначыў дулебскую (палескую) і анцкую дыялектныя зоны [57]. Яны ахоплівалі большую частку Украіны і далёка

выходзілі за яе межы. У анцкай зоне ім вызначаны арэалы галіцкі і падольскі [57, с. 34–36, карта 2]. У галіцкі арэал уключана Закарпацце.

Расійскія даследчыкі С. Л. Нікалаеў, А. В. Тэр-Аванесава і М. Н. Талстая прысвяцілі артыкул аналізу палескіх гаворак у праславянскай перспектыве [58, с. 100–140]. Узяты праславянскі кампанент, зафіксаваны ў сучасных гаворках, і пракартаграфаваны. У межах Украіны аўтарамі вызначаны наступныя адзінкі.

1. Гаворкі ўсходняпрыпяцкай групоўкі, якія ўзыходзяць да драўлянска-палянскага дыялекта X–XII стст. Ахоплівалі яны тэрыторыю ад Гарыні на захадзе да паўночна-ўсходніх меж Украіны.

2. Гаворкі верхняпрыпяцкай групоўкі, якія ўзыходзяць да старажытнавалынскага дыялекта X–XII ст. Ад іх засталіся рэшткі: пераважна ў Пагарынні і некаторых мікрарэгіёнах Берасцейшчыны.

3. Гаворкі змешанага паходжання, у аснове якіх ляжаць старажытнавалынскія і паўночнагаліцкія (паўночныя дня455строўска-харвацкія) гаворкі X–XII стст.

Звернем увагу на адзін пучок фанетычных ізаглос, які дзеліць Славію на дзве зоны – паўночную і паўднёвую [24, с. 81–83; 37, с. 227–235; 13, с. 109–111]. Так, гаворкам паўночнай зоны характэрнае адрозніванне **i* і **ы* (руская, беларуская, польская, лужыцкія мовы), пераважная мяккасць губных зычных і пярэднеязычных перад **e, *i* (тыя ж мовы і славацкая мова), цеканне-дзеканне (беларуская, польская, лужыцкія мовы, некаторыя гаворкі моваў рускай, славацкай, чэшскай). Адпаведна ў гаворках паўднёвай зоны галосныя **i* і **ы* зліліся ў адзін гук (паўднёваславянскія, украінская, чэшская, славацкая мовы), пярэднеязычныя і губныя зычныя перад **e, *i* вымаўляюцца цвёрда (чэшская мова, акрамя пазыцыі **d, *t, *n* перад **i*, мовы паўднёваславянскія і ўкраінская мова), цеканне-дзеканне адсутнічае (мовы паўднёваславянскія, чэшская, славацкая, украінская, руская). Руская мова адносіцца да паўночнай зоны, але з элементамі пераходнасці. У большасці рускіх гаворак адсутнічае цекенне-дзеканне, а ў некаторых гаворках захаваліся паўмяккія пярэднеязычныя перад **e, *i* [31, с. 220–221; 42, с. 3–12]. Безумоўна, фармаванне падобных зонаў мела свае прычыны.

Беларускі вучоны А. А. Крывіцкі заўважае: «Мяркуюць, што старажытнарускія дыялекты адрозніваліся адзін ад другога нават у большай ступені, чым цяперашнія ўсходнеславянскія мовы» [47, с. 21].

Украінскі і беларускі інавацыйныя цэнтры. Ва Ўкраіне і ў Беларусі, як і ў астатняй Славіі, панавала праславянская мова. Пазней у розных рэгіёнах Славіі ўзніклі інавацыйныя цэнтры – тэрыторыі, дзе ў гаворках з'явіліся комплексы новых асаблівасцей, не характэрных старой праславянскай мове. Мы звернем увагу на два такія цэнтры, якія датычацца нашай тэмы. Гэта інавацыйныя цэнтры – праўкраінскі і прабеларускі. Прабеларускі інавацыйны цэнтр, на нашу думку, узнік недзе ў раёне Гомеля [22, с. 21–23]. А дзе ж знаходзіўся праўкраінскі інавацыйны цэнтр? Паразважаем на гэтую тэму. Якія гаворкі самыя блізкія да сучаснай украінскай літаратурнай мовы? Гэта сярэднепрыдняпроўскія і падольскія гаворкі. А ў якіх гаворках найбольш тыповыя ўкраінскія рысы выступаюць таксама доволі паслядоўна? А гэта гаворкі Галічыны і Паўночнага Прыкарпацця. Але ж гэтыя гаворкі ў параўнанні з сярэднепрыдняпроўскімі і падольскімі маюць сваю спецыфіку! А гэта звязана з тым, што галічане і прыкарпатцы больш кантактавалі з іншымі этнасамі, чым сярэднепрыдняпроўцы. Праўкраінскі інавацыйны цэнтр мог пашырацца, мог звужацца. Ён быў пашыраны пераважна ў лесастэпе. Ён мог ахопліваць тэрыторыю ад вярхоўяў р. Сян да Палтавы, а мог абмяжоўвацца толькі раёнамі Вінніцы і Чаркас. Паступова ўкраінскі і беларускі інавацыйныя цэнтры пашыраліся. Яны ўключылі і большую частку Палесся. Але гэта ўжо былі не інавацыйныя цэнтры, а часткі арэалаў украінскай і беларускай моў.

Адна тыповая праславянская рыса – паўмяккасць (абазначаем [·]) зычных **д·, *т·, *з·, *с·, *н·* перад **е, *і*. У большасці сучасных славянскіх гаворак прыведзеныя зычныя ў адзначанай пазіцыі вымаўляюцца або мякка, або цвёрда. Але сустракаюцца гаворкі, у якіх у дадзенай пазіцыі захавалася праславянскае паўмяккае вымаўленне гэтых зычных, напрыклад, *д·энь, н·э́бо, з·има́, с·и́ла, ход·и́т·и* [41, с. 255–257]. Да іх, у прыватнасці, адносяцца:

1. Гараднянскія гаворкі ў Столінскім раёне Берасцейскай вобласці: мястэчка Гарадная, суседнія вёскі Лісцянкі, Лука́,

Лучы́ца, Пясо́ва, Раўча́к [30, с. 118–120, 129–129; 31, с. 214, 218–220; 35, с. 454–465; 40, с. 261–268].

2. Гаворкі вёсак Рэчкі Івацэвіцкага і Трасцянка Пінскага раёнаў Берасцейскай вобласці [69, с. 96, 103].

3. Усходнеславянскія гаворкі шэрагу вёсак на паўднёвым усходзе Падляшскага ваяводства ў Польшчы: Hołody, Dubicze, Jagodnik(i), Klejniki, Kojły, Kuraszewo, Mochnata, Mor(z)e, Mytłasze, Nowe Berezowo, Nowy Kornin, Pasynki, Tofiłowce, Trzeszczotki, Wygody, Zbucz [93, s. 27, 35–37, załączniki 1–3]. Не ва ўсіх гэтых гаворках разглядаемая рыса адлюстроўваецца паслядоўна.

4. Гаворка в. Машава Чарнобыльскага раёна Кіеўскай вобласці [10].

5. Сустракаецца разглядаемая рыса ў некаторых сярэднепалескіх украінскіх гаворках [55, с. 77–78].

Усе прыведзеныя дыялектныя адзінкі знаходзяцца на Палессі.

У некаторых рускіх гаворках зычныя [*д*], [*т*], [*з*], [*с*], [*н*] перад **е, *и* вымаўляюцц паўмякка [31, с. 220; 12, 65]. Гэта, магчыма, сведчыць пра тое, што гаворкі на тэрыторыі Расіі працяглы час захоўвалі праславянскі стан.

Пры фарміраванні расійскага этнасу, відаць, мелі месца перасяленні з Палесся і суседніх абласцей [31, с. 219–221; 42, с. 3–12].

Субстрат этнічны. Ад праславян украінцы атрымалі шэраг этнічных субстратаў. Субстрат этнічны – гэта этнас або яго частка, асіміляваныя іншым этнасам. У пэўнага народа ёсць субстрат асноўны або вызначальны і субстраты іншыя або перыферыйныя. Асноўны субстрат у свой час адыграў вялікую або нават вызначальную ролю ў этнагенезе. Да асноўных этнасаў, у прыватнасці, адносяцца: у беларусаў – балты, у расейцаў – заходныя фіны, у чэхаў – кельты, у балгараў – фракійцы, у сербаў і харватаў – ілірыйцы, у румын – дакі, у французаў – галы, у грэкаў – пелазгі і г. д.

А які этнас з'яўляецца асноўным ці вызначальным этнасам у ўкраінцаў? Часцей за ўсё называюць іранамоўных скіфаў, сарматаў, трыпольцаў. Наколькі можна з гэтым згадзіцца? Гаворачы пра скіфаў, неабходна спыніцца на скіфах-аратых (Σκύϑαι ’αροτηρες). Жылі яны ў правабярэжнаднянпроўскім і часкова левабярэжнадняпроўскім лесастэпе. Паколькі Герадот

адносіць іх да скіфаў, дык многія даследчыкі лічаць іх іранцамі. Аднак шэраг вучоных звярнулі ўвагу на наступныя акалічнасці. У зоне рассялення скіфаў-аратых выяўлены ўсяго толькі адзінкі іранскіх гідронімаў, у той жа час вялікая колькасць гідронімаў архаічных праславянскіх [83, с. 270–274, 276–277, 287; 78, с. 69–79; 8, с. 217--225]. Вывады гэтых даследчыкаў адназначныя: скіфы-аратыя – гэта (пра)славяне. Такім чынам, іранамоўныя скіфы і сарматы не маглі быць вызначальнымі субстратнымі этнасамі для выдзялення (пра)ўкраінцаў, паколькі яны жылі на параўнальна невялікай частцы цэнтральна-заходняй украінскай зоны, дзе адбываўся этнагенез (пра)ўкраінцаў.

Іншыя перыферыйныя субстраты (пра)краінцаў: балты, ілірыйцы, фракійцы, кельты, індаарыйцы [71, 1; 82; 83, с. 269–289; 85; 89].

Дык які ж этнас мог быць вызначальным субстратам у выдзяленні (пра)ўкраінцаў з праславянскай агульнасці? З некаторымі агаворкамі такімі можна назваць трыпольцаў ці дакладней – іх нашчадкаў. Трыпольцы -- носьбіты трыпольскай культуры [92, с. 165–252; 3, с. 186–263; 9]. Засялялі трыпольцы каля 70 % тэрыторыі цэнтральна-заходняй украінскай зоны, дзе адбываўся этнагенез (пра)ўкраінцаў. Трыпольская культура існавала звыш 2,5 тысяч год, прыкладна ў 5400/5300 – 2800/2650 гг. да н.э. [9, с. 50--51]. Трыпольская культура – адзін са славутых ачагоў (агменяў) сусветнай цывілізацыі старажытных часоў. Асноўныя галіны гаспадаркі трыпольцаў – земляробства і жывёлагадоўля. Высокага ўзроўню дасягнулі металаапрацоўка і ганчарная вытворчасць. Некаторыя населеныя пункты трыпольцаў выдзяляюцца сваёй велічынёй. Да іх, у прыватнасці, адносяцца наступныя трыпольскія пасяленні: Майданецкае (270 га), Дабраводы (250 га), Тальянкі (400 га). Гэта павселішчы-гіганты. Усе яны размешчаны на захадзе сучаснай Чаркаскай вобласці Украіны. У такіх паселішчах жыло па некалькі тысяч чалавек. Вучоныя лічаць іх протагарадамі і нават гарадамі. Выказваецца думка, што адзначаныя паселішчы-гіганты з'яўляюцца руінамі агульнатрыпольскіх сталіц, якія паслядоўна замянялі адна другую [92, с. 240]. Высокага ўзроўню дасягнула мастацтва Трыполля. Вучоныя канстатуюць, што «ў гісторыі першабытнай Еўропы трыпольская культура была тым, чым была эпоха Рэнесансу для сярэднявечча» [66, с. 173–174].

Вось што гаворыць А.М. Трубачоў пра адну гідранімічную зону ва Ўкраіне «Чрезвычайно важным кажется то, что наиболее надежные примеры восточнобалканского происхождения выступают у нас в Побужье, на Тетереве и соседнем Среднем Днепре, представляя совершенно особую <…> зону. <…> Эти восточнобалканско-южнобугско-среднеднепровские связи нетрудно поставить в связь с ареалом трипольской культуры в археологии <…>».[83, с. 282–283, 287].

Украінцы і праславяне. Украінцы – славянскі этнас і ўзыходзяць яны да старадаўняга этнасу праславянскага. Таму ўкраінцы атрымалі ў спадчыну ад праславян моўную аснову, а таксама пэўную частку дыялектнага ландшафту. Да апошняга, у прыватнасці, адносіцца мяжа па р. Гарынь, мяжа паміж лясной зонай і зонай лесастэпу і інш.

Праславяне. Фарміраванне праславянскага этнасу – справа складаная, працяглая і далёкая да свайго канчатковага вырашэння [23, с. 71–77; 84; 51]. Завяршальнаму этапу этнагенэзу праславян папярэднічалі эпохі іх нязначнай адасобленасьці ад іншых індаеўрапейцаў, этнічнай «рыхласці», «залатых» вякоў, «змрочных» часоў і інш. Для ўзнікнення пэўнай моўна-дыялектнай сістэмы і пашырэння на значнай тэрыторыі патрэбны працяглы час. Трапляючы на пэўны пэрыяд у неспрыяльныя ўмовы, мова або захоўвае сваю аснову, або выцясняецца з ужытку іншай мовай. Узнікненне той ці іншай моўна-дыялектнай сістэмы як асобнай мовы – з'ява ўнікальная, складаная і працяглая. Гэта датычыць, безумоўна, і мовы праславянскай.

Міф: розныя мовы ў адной сям'і. Некаторыя даследчыкі прытрымліваюцца думкі, што праславяне сфарміраваліся на працягу вельмі кароткага часу і ў выніку змешвання частак двух этнасаў. Ці магло такое адбыцца? Уявім сабе наступнае. Пажаніліся, напрыклад, італіец з пралітоўкай. Італіец не ведаў пралітоўскац мовы, пралітоўка – італійскай. Як яны маглі ў сям'і кантактаваць? Потым у іх нарадзіліся дзеці. А дзеці ўжо гаварылі па-праславянску. Атрымліваецца, што дзеці ў 1-3 гады, слухаючы мову бацькоў, стваралі праславянскую мову. Між тым, у першабытныя часы быў пашыраны білінгвізм. Гэта выявілі даследчыкі, назіраючы ў апошнія стагоддзі над жыццём людзей, якія яшчэ жылі ва ўмовах першабытнаабшчыннага ладу [18, с. 467–473].

Міф: ці ў IV–VI стст. зрынулі славяне з неба? У пісьмовых крыніцах славяне з'яўляюцца ўпершыню ў ў IV–VI стст. н.э. [70]. Пісьмовыя крыніцы падмацоўваюцца археалагічнымі дадзенымі. Паводле пісьмовых і археалагічных крыніц у сярэдзіне і 3-й чвэрці I тыс. н.э. славяне жылі на Балканскім паўвострае, ва ўсходніх Альпах, на Дунаі, у сучасных Чэхіі, Польшчы і ўсходняй Германіі, у Прыпяцкім Палессі, Правабярэжнай і Заходняй Украіне, у Сярэднім Падняпроўі, у раёне Пскова і Ноўгарада. Такім чынам, славяне адразу ж у сярэдзіне I тыс. н. э. заяўляюць пра сябе, як пра вялікі народ. Відаць у гэты час адбылася кансалідацыя славян. А што магло быць прычынай такога факту? У гэты час славяне ўваходзілі ў склад Гунскай імперыі. Можа гэта і ёсць прычына такой часовай кансалідацыі? Павялічэнне колькасці славян і пашырэнне тэрыторыі, заселенай імі, адбывалася не толькі шляхам натуральнага прыросту, але і ў выніку асіміляцыі прадстаўнікой іншых, неславянскіх этнасаў. А ці маглі (пра)славяне ў IV–VI стст., на працягу 2-х – 3-х стагоддзяў, сфарміравацца як этнас у нейкім мікрарэгіёне і пашырыцца на тэрыторыі, роўнай чатыром сучасных Германій або тром сучасных Францый? Безумоўна, не.

Прыблізна 1500–1100 гадамі да н.э. датуецца тшцінецкая (тшцінецка-камароўская, тшцінецка-камароўская-сосніцкая) археалагічная культура ці супольнасць. Многія даследчыкі зяўляюцца прыхільнікамі гіпотэзы, што гэтая культура ў сваёй аснове адносіцца да славянскіх (праславянскіх) старажытнасьцяў [2, с. 298, 569, 582–583, 619–620; 91, с. 106–116; 3, с. 422, 437–445; 49, с. 61, 69–70; 6; 80, с. 4–56, 59–62; 65, с. 207–208; 66, с. 221–224]. Мы лічым, што гэты пункт погляду заслугоўвае ўвагі [23, с. 71–77].

Тшцінецкая культура ахоплівала тэрыторыю ад Одры на захадзе да раёну Курска на ўсходзе, ад верхняга Нёмана і Магілёва-на-Дняпры на поўначы да Карпат на поўдні. На гэтай тэрыторыі ці яе частцы (заходняй або ўсходняй) большасьць дасьледнікаў разьмяшчае прарадзіму славян. Тут жа пашырана архаічная славянская гідранімія, хоць яна і выходзіць па-за яе межы [82, 9; 83, с. 246–273; 19, с. 52–59; 8, с. 217–225]. Тшцінецкая культура – гэта хутчэй за ўсё не пачатковы, а завяршальны этап этнагенезу праславян. Праз тшцінецкую культуру праславяне ўпершыню археалагічна заявілі пра сваё існаванне. Узнікненне той ці іншай моўна-дыялектнай сістэмы

як асобнай мовы – з'ява ўнікальная, складаная і працяглая. Гэта датычыць, безумоўна, і мовы праславянскай. Даследчыкі звярнулі ўвагу, што пасля спынення існавання тшцінецкай культуры арэал яе пашырэньня праз пэўныя перыяды неаднаразова «адраджаўся» [66, с. 217–230]. Гэта хутчэй за ўсё сведчыць аб устойлівасьці этнасу на азначанай тэрыторыі. У гістарычны перыяд крыніцы засведчылі ў гэтай вобласьці славян.

Тшцінецкая (тшцінецка-камароўская) археалагічная супольнасьць не была адзінай. Адзін з найбольш спэцыфічны яе варыянт – камароўскі. Некаторыя даследчыкі лічаць яго асобнай культурай, хоць і блізкай да культуры ўласна тшцінецкай. Камароўскі варыянт быў пашыраны ў Верхнім Падняствроўі, паўднёвай Валыні, заходнім Падоллі і сумежных рэгіёнах [91, с. 108–109; 3, с. 422, 437–445]. Як бачым, арэал камароўскага варыянта тшцінецкай культуры ахоплівае асноўную частку арэала тых варыянтаў трыпольскай культуры, якія былі пашыраны ва Украіне. У дадзеным выпадку, відаць, у камароўскай еднасці археалагічна найбольш яскрава заявіў пра сябе трыпольскі субстрат. Хоць, хутчэй за ўсё, нашчадкі трыпольцаў часткова ўвайшлі і ў склад іншых этна-культурных груп. Археалагічая культура адлюстроўвае супольнасць этнаграфічную і супольнасць духоўнай культуры, але яна не заўсёдны супадае з арэалам таго ці іншага этнасу. З гэтага гледзішча, прытрымліваючыся гіпотэзы аб праславянскім характары тшцінецкай культуры, нельга не дапусціць, што частка тшцінеўцаў не зяўлялася славянамі (праславянамі). У той жа час праславянскія групы ў часы існавання тшцінецкай культуры маглі ўваходзіць у склад іншых культурна-гістарычных супольнасцяў. У шэрагу рэгіёнаў і мікрарэгіёнаў, асабліва на ўзмежжы арэала, тшцінеўцы, відавочна, жылі церазпалосна з прадстаўнікамі іншых этнакультурных груп. Каля 1100 г. да н.э. арэал тшцінецкай (праславянскай у аснове?) вобласьці падзяліўся на тры часткі. Заходняя яго частка, размешчаная на захад ад Гарыні, увайшла ў склад арэалу лужыцкай культуры (1200– 400 г. да н.э.) [2, с. 375; 4, с. 22, 39–43; 49, с. 71–100; 64, с. 19–20; 46, с. 8–30, 60–71; 45, с. 9–18, 37–45]. Усходнія групы носьбітаў гэтай культуры з'яўляюцца нашчадкамі тшцінеўцаў. На тэрыторыі паўднёва-усходняй часткі тшцінецкай культуры (уласна тшцінеўскі і камароўскі

варыянты), ва ўкраінскім лесастэпе на паўднёвы ўсход ад вярхоўяў Гарыні, сфарміравалася белагрудаўская культура (1100 – 900 г. да н.э.) [3, с. 499–512]. У яе фарміраванні, відаць, прынялі ўдзел, акрамя мясцовых камароўцаў, камароўцы – выхадцы з Прыкарпацця. На грунце белагрудаўскай культуры фарміруецца культура чарналеская (900–750 г. да н.э.) [4, с. 22, 29–337], на аснове апошняй – жабоцінскі культурны тып (750 – 650 г. да н.э.) [4, с. 33–36], на аснове жабоцінскага тыпу – заходнепадольская, усходнепадольская, валынская, кіеўска-чаркаская і ворсклінская групы скіфскай лесастэпавай культуры (650– 250 г. да н.э ) [4, с. 62, 90–117; 77, с. 67–76.]. На Палессі на ўсход ад Гарыні і ў сумежных рэгіёнах, у тым ліку ў Верхнім Панямонні, на грунце тшцінецкай культуры склалася культура лебядоўская (рубеж XII–XI – пачатак VIII ст. да н.э.) [2, с. 363–364; 3, с. 445–450], пераважна на яе аснове склалася культура мілаградская (VIII –III ст. да н.э.) [2, с. 427–428; 54; 14, с. 76–105; 64, с. 8–16; 4, с. 178–181; 48, с. 25–26, 40]. У раёне Цярнопаля, Львова, Ковеля, Сарнаў, Ракітна існавала высоцкая культура (X–VI ст. да н.э.), што таксама ўзыходзіць да тшцінецкай культуры, якая мела пераходны характар паміж лужыцкай і сінхроннымі культурамі Палесся і лесастэпу [46, с. 71–86; 48, с. 25]. У значнай ступені мела пераходны характар і ляжніцкая група, размешчаная на паўночным захадзе Валыні (IX– пачатак V ст. да н.э.) [45, с. 60–72; 46, с. 86–90].

Межы, якія раздзялілі каля 1100 г. да н.э. арэал тшцінецкай (праславянскай?) зоны, праіснавалі (з некаторымі, праўда, зменамі) некалькі стагоддзяў. Цікава, што з імі супадаюць некаторыя сучасныя этна-дыялектныя межы. Найперш гэта датычыць мяжы па р. Гарынь, дзе праходзіць выразна акрэслены пучок ізаглос, ізапрагм, ізадокс. Паводле аднадушнай думкі даследчыкаў, гэтая мяжа мае глыбокія гістарычныя карані [80, с. –17; 81, с. 3–21; 50; 48, с. 18–46]. Другая мяжа – паміж зонай лесу і зонай лесастэпу ў Падняпроўі і суседніх рэгіёнах. Яна ў асноўных рысах супадае з мяжой паміж гаворкамі паўднёва-заходнімі і паўднёва-усходнімі ўкраінскімі, з аднаго боку, і гаворкамі паўночнаўкраінскімі, з другога [5, I, кк. III, IX]. Тут жа праходзіць мяжа палескага этнаграфічнага рэгіёну [44].

У земляробчых плямёнаў прыдняпроўскага лесастэпу да V ст. да н.э. склаліся ранняклсавыя дзяржавы («царствы») [77, с. 124; 67, с. 24; 68, с. 40–72; 17, с. 367], якія, аднак,

знаходзячыся ў складзе Скіфкага аб’яднання, былі залежныя ад «царскіх» скіфаў. Гэтыя «царствы», ва ўсякім разе да IV ст. да н.э., захоўвалі аўтаномію. На думку некаторых даследчыкаў, гэтыя «царствы» ўзніклі яшчэ ў чарналескую епоху [63, с. 42–43].

Ціск з боку стэпавых скіфаў выклікаў перамяшчэнне земляробчага насельніцтва з прыдняпроўскага лесастэпу на захад, змяшэнне яго з мясцовым тамтэйшым насельніцтвам – у выніку гэтага ўтварыліся новыя этнічныя (этна-культурныя) групы. Так узніклі археалагічныя групы магілянская (VI пачатак V ст. да н.э.; раён Ізяслава, Крамянца, Роўна, Дубна) і чарэпінска-лагадаўская (VII– пачатак V ст. да н.э.; раён Галіча, Львова, Драгобыча, Самбара) [45, с. 61, 72–105]. Такім чынам, да V ст. да н.э. арэал паўднёва-усходняй групы нашчадкаў тшцінеўцаў перамясьціўся на захад да лініі: вытокі Днястра, Львоў, Луцк. Адчуваўся ўплыў гэтай групы, а таксама скіфскага свету, на лужыцкае насельніцтва Пабужжа [45, с. 60–72].

Існуе думка, што так званыя скіфы-аратыя ці земляробчае насельніцтва прыдняпроўскага лесастэпу ў скіфскую эпоху было іранамоўным. Аднак усё больш прыхільнікаў набывае пункт погляду, што гэтае насельніцтва, прынамсі, асноўная частка жыхароў лесастэпавага дняпроўскага Правабярэжжа, было славянамоўным [65, с. 195–238; 78, с. 69–79; 1, с. 22.]. Галоўным аргумэнтам на карысьць думкі аб славянскай прыналежнасьці гэтага насельніцтва зьяўляецца факт, што ў лесастэпавым дняпроўскім Правабярэжжы практычна адсутнічаюць іранскія гідронімы і ў той жа час тут выяўлена вялікая колькасі архаічных славянскіх гідронімаў [83, с. 246–288.]. Ва ўмовах працяглага скіфскага панавання распаўсюдзіўся білінгвізм, частка насельніцтва, відавочна, поўнасцю перайшла на іранскую скіфскую мову, тут укаранілася скіфская культура [1, с. 22–23]. Аднак поўнай моўнай скіфізацыі сярэднепрыдняпроўскага лесастэпавага праславянскага(?) насельніцтва, як мяркуюць некаторыя дасьледчыкі, хутчэй за ўсё не адбылося, паколькі, як ужо гаварылася вышэй, скіфскія іранскія гідронімы ў разглядаемым рэгіёне (на захад ад Дняпра) практычна асутнічаюць.

Панаванне скіфаў пашырылася далёка на паўночны захад. У канцы VI ст. да н.э. большая частка арэалу лужыцкай культуры была заваяваная скіфамі. Сляды разбурэння скіфамі лужыцкіх

гарадзішчаў, а таксама знаходкі знадбеняў скфскага ўзбраення і іншых рэчаў выяўлены да лініі: Зялёна Гура, Познань, Быдгашч, Плоцк, Люблін [49, с. 96, 99–100]. Лужыцкая культура не была знішчаная скіфамі, а ў некаторых мясцовасцях дажыла да IV–III ст. да н.э. [ 4, с. 41]. Сведчаннем працяглага скіфскага панавання над большай часткай праславян, відавочна, з'яўляецца прыкметны ўплыў іранскай (скіфскай) мовы на праславянскую мову [52, с. 46–57, 93–95]. У прыватнасьці, гэта адлюстравалася не толькі ва ўсходнеславянскіх мовах, але і ў польскай мове, арэал якой ўпісваецца ў арэал лужыцкай культуры. У праславянскую мову ў першую чаргу ўвайшла іранская сакральная (рэлігійная, культавая) лексіка, што адлюстроўвае адносіны паміж заваяванымі (славянамі) і заваёўнікамі (скіфамі) [52, с. 46].

Анты, улічы, Артанія [32, с. 203–205]. Анты – славянскі племянны саюз (протадзяржава) 4–7 стст. Ахопліваў лесастэпавую і частку стэпавай Украіны, Малдову, часткі Румыніі і Балгарыі [72, с. 106–107]. Іх протагорад – Пастырскае гарадзішча 6–8 стст. (Чаркаская вобласць) [34, с. 17]. Частка антаў пасялілася ў іншых краінах. У 270 г. у адным грэчаскім надпісу з г. Керч згадваецца ’Άντας παπι (ант Папіёс, Папіён?) [87, с. 59]. У дадзеным выпадку абазначана этнічная прыналежнасць асобы. Як народ анты ўпершыню згадваюцца ў 551 г.у Іардана. Але гаворыцца тады не толькі пра падзеі VI ст., але і пра падзеі IV ст. Апошні раз анты згадваюцца ў 602 г. У пачатку VII ст. Анцкі саюз быў разгромлены аварамі.

Праз некаторы час асноўная частка нашчадкаў антаў адрадзіла сваё адзінства і ўтварыля племянны саюз (протадзяржаву) улічаў. Яны першапачаткова засялялі паўднёвае і часткова сярэдняе Прыдняпроўе, а таксама частку басейна Паўднёвага Буга. Сталіцай улічаў з'яўляўся горад

Перасе́чань/Перасе́чын (каля 800–1300 гг.). Знаходзіўся ён, на думку даследчыкаў, на тэрыторыі ўсходняй, левабярэжнадняпроўскай часткі сучаснага г. Днепрапятроўска. Улічы з'яўляліся адным з найбольш шматлікіх славянскіх плямёнаў. Паводле Баварскага Географа яны мелі 418 «гарадоў» (умацаванняў).

У тыя часы фарміравалася Кіеўская Русь. Большасць усходнеславянскіх плямёнаў увайшло ў яе склад. Аднак, улічы доўгі час адстойвалі сваю незалежнасць ад Кіева. Князь Алег

ваяваў з улічамі 10 год – падпарадкаваць яму улічаў не ўдалося. Ваявода князя Ігара Сванельд патраціў тры гады, пакуль заваяваў сталіцу улічаў і то дзякуючы дапамозе печанегаў. Пад націскам печанегаў і іншых качэўнікаў улічы былі выцеснены на захад і на поўнач. Улічы, відаць, адыгралі вызначальную ролю ў фарміраванні цэнтральнага ядра ўкраінцаў – яго сярэднепрыдняпроўскай групы.

Артанія – старадаўняя ўсходнеславянская вобласць, якая вядома пераважна з прац Аль–Істахры і Ібн–Хаукаля. А л ь – І с т а х р ы паходзіў з Фарса (Персія). «Кнігу кліматаў» напісаў да 965 г. І б н – Х а у к а л ь родам з Багдада. «Кнігу шляхоў і дзяржаў» закончыў каля 976/977 гг. Абодва аўтары ў адзначаных працах гавораць пра дзяленне Русі на тры «племені» [раннедзяржаўныя ўтварэнні]. Адно з іх бліжэй да Булгара (Волжская Булгарыя). Цар яго знаходзіцца ў горадзе *Куяба* (Атаясамліваецца з горадам Кіевам). Другое племя «вышэй першага» [знаходзілася далей на поўнач], яно называецца *Славія*. Трэцяе племя – *А р т а н і я* (варыянт: *Арсанія*). Цар яго знаходзіцца ў [горадзе] *Арта*. З трох адзначаных усходнеславянскіх земляў самая блізкая да Волжскай Булгарыі – *Куяба*. Адсюль вынікае, што *Артанія* знаходзілася далей ад гэтай краіны, чым *Куяба*, г.зн. не на ўсход ці паўночны ўсход ад Кіева, а ў нейкім супрацьлеглым кірунку, больш дакладна – паміж Хазарыяй і Дунайскай Балгарыяй. Гэта Паўночнае Прычарнамор'е, дзе паводле «Аповесці мінулых гадоў» жылі *улічы*, а паводле крыніц VI ст. – *анты*. «Аповесць мінулых гадоў» сведчыць, што племя *улічаў* шматлікае. Паводле Баварскага Географа, *unlizi* (улічы) таксама з'яўляліся шматлікім племенем, яны мелі ажно 418 «гарадоў». Канстанцін Багранародны называе гэтае племя ουλτινοι. [56, с. 154]. Далей у Істахры: «Арта знаходзіцца паміж Хазарам і Вялікім Булгарам [Дунайскай Балгарыяй], які мяжуе з Румам [Візантыяй]. Яны шматлікія і такія моцныя, што наклалі даніну на пагранічныя мясціны з Рума (Візантыі)». У часы Першага Балгарскага царства (681–1018 гг.) Артанія не межавала з Візантыяй, таму не магла захапіць візантыйскія тэрыторыі і накласці на іх даніну. Такое магло быць толькі да 681 г. А гэта – эпоха антаў. Анты ж VI–VII стст., у прыватнасці, асноўная, прычарнаморская іх частка – гэта продкі *улічаў* VIII–X стст. Этнонім *анты* не з'яўляўся саманазвай. Ён вядомы з грэчаскіх (візантыйскіх) і

лацінскіх крыніц. Грэкі ж запазычылі яго ў неславянскага насельніцтва Паўночнага Прычарнамор'я. Ці можна быць упэўненым, што гэты этнонім быў невядомы народам, якія жылі на паўднёвы ўсход ад візантыйцаў? Хутчэй за ўсё было наадварот. Калі ж этнонім пераходзіць з мовы ў мову ў вуснай форме, дык часцей бываюць нейкія скажэнні, чым іх не бывае. Параўнаем цяпер назвы аднаго і таго этнасу: індаарыйска-грэчаская анты і арабска-персідская *Арта*. Розніца ў зычных гуках *н ~ р*. Разглядаемы этнонім не мог непасрэдна трапіць з грэчаскай мовы ў арабскую. У візантыйцаў этнонім *анты*, згодна пісьмовых крыніц, быў найбольш ужывальны ў VI ст. Арабская ж дзяржава ўтварылася толькі ў VII ст. Што датычыцца багатай арабскай літаратурнай традыцыі, дык яна складаваецца яшчэ пазней. Славяне вядомы арабам з VII ст. Пры гэтым, славян у цэлым арабы называлі *сакаліба*. Адны з найбольш ранніх пісьмовых звестак пра *Артанію* знаходзім у Аль-Істахры, які нарадзіўся ў старажытнай сталіцы Персіі, горадзе Істахры, былым Персепалі. Натуральна дапусціць, што этнонім *анты*, перш чым трапіць у арабскую літаратуру, быў вядомы персам. Гэта тым больш рэальна, што персідская мова да VI–VII стст. мела багатую пісьмовую традыцыю. Ці былі ўмовы для пераходу кампанента *ант-* у *арт-* ва ўмовах персідскай мовы? Хутчэй за ўсё, так. Параўн. імя персідскіх цароў *Артаксеркс I* (V ст. да н.э.), *Артаксеркс II* (V–IV стст. да н.э.), *Артаксеркс III* (IV ст. да н.э.), старажытнаіндыйскі (санскрыцкі) помнік *Арташастра*. Звернем увагу на іншыя старажытнаперсідскія імёны: *Артабаз, Артабазан, Артабан, Артазаотр, Артаінта, Артамісія, Артамітый, Артан, Артапат, Артафрэн, Артыстона, Артыфій, Арэта, Арсак, Арсам, Арсамен, Арсім, Арсіт* [Тимахович].

Арэал пашырэння персідскай мовы аддзяляўся ад арэалу грэчаскай мовы арэалам мовы армянскай, якая таксама мае багатую пісьмовую традыцыю. Этнонім *анты* мог трапіць у Персію праз армянскае моўнае пасрэдніцтва. У армянскіх умовах (моўных) таксама існавалі даволі спрыяльныя ўмовы для пераходу асновы разглядаемага этноніма *ант-* у *арт-*. Параўн.: *Артавазд II* – армянскі цар I ст. да н.э., *Арташэс I* – армянскі цар II ст. да н.э., *Арташат, Артвін, Артык* – гарады ў Арменіі. Цікавымі падаюцца дадзеныя старажытнаармянскай мовы, у якой панянцце 'поле' пазначаецца словамі *art* і *and* [86, с. 46, 48,

50, 59, 123]. Калі б крыніцай паходжання разглядаемых назваў з'яўлялася старажытнаармянская мова, дык вырысоўваецца арыгінальны рад: *паляне* (ад *поле*) = *анты* (ад *and* 'поле') = *Арта* (ад *art* 'поле'). На думку некаторых даследчыкаў, *палянамі* называлася паўднёва-заходняя група ўсходнеславянскіх плямёнаў [7, с. 141–148].

Паляне кіеўскія і лесастэпавыя. Прынята лічыць, што племя п а л я н е лакалізавалася ў Сярэднім Падняпроўі з цэнтрам у Кіеве [73]. Яно вызначаецца археалагічна. У той жа час узнікаюць пытанні. «Паляне», зыходзячы з назвы, павінны жыць у «полі», г.зн. у мясцовасці, дзе мала лесу, у прыватнасці, у лесастэпе. А наваколлі Кіева былі лясістыя. І яшчэ. С. Л. Мікалаеў і іншыя даследчыкі выявілі, што ў позні праславянскія часы дыялект палян не адрозніваўся ад дыялекту драўлян [58].

На думку М. Ю. Брайчэўскага, п а л я н а м і з'яўляліся плямёны, якія жылі ў лесастэпе і ў Карпатах [7, с. 141–148]. М. Ю. Брайчэўскі, аднак, лічыць магчымым, што лесастэпавыя паляне прымалі ўдзел у заснаванні і засяленні г. Кіева.

Яшчэ пра Сярэдняе Прыдняпроўе. Сярэдняе Прыдняпроўе – гэта ядро ўкраінскага этнасу. Але існує міф, што гэты рэгіён у часы мангола-татарскай навалы быў цалкам спустошаны, што тут амаль не засталося мясцовага насельніцтва. І што засяляўся ён канава выхадцамі з Палесся, Галічыны, Валыні. Калі б такое было, дык мы бачылі б у Сярэднім Прыдняпроўі наступнае. Вядома, за шэраг стагоддзяў многае б стерлася. Але многае і засталося б. І ў Сярэднім Падняпроўі мы бачылі б мазаічнае размяшчэнне гаворак з асновай плескай, галіцкай, валынскай. Праца Г. . Мартынавай паказала іншае [53]. Абсалютная большасць гаворак гэтага рэгіёна ўяўляе стройную сістэму. Стройную сістэму ўяўляе і дыялектны ландшафт Сярэдняга Прыдняпроўя. Успамінаю адну сваю гутарку з нябожчыкам Н. І. Талстым. Я выказаў сваю думку наконт глотагенезу сярэднепрыдняпроўскіх украінскіх гаворак і этнагенезу сярэднепрыдняпроўскіх украінцаў, пра што я пішу ў гэтым артыкуле. На гэта Нікіта Ілліч адказаў мне прыкладна так: «Я падобнае магу сказань пра паўднёвую Расію. Многія лічаць, што яна была поўнасцю спустошена і засялялася пазней выхадцамі з цэнтральнай і паўночнай Расіі. Калі б гэта было так, дык мы на поўдні Рассіі назіралі б нейкую мазаіку сярэдне- і

паўночнарасійскіх рыс у народных гаворках, этнаграфіі, матэрыяльнай і духоўнай культуры. А мы бачым ўсё такое арыгінальнае, такую стройную сістэму».

Адзначым яшчэ, што аўтар гэтых радкоў разглядае тыя ці іншыя пастаўленыя ў артыкуле праблемы ў шэрагу іншых публікацый [27, с. 126–133; 28 с. 237–241; 40, с. 92–94; 43, с. 193–200].

### Літаратура


**1.** Абакумов О. В. Відгалуження антського діалекта пізньої слов'янської мовної єдності за синтезованими лінгво-археологічними свідченнями // Ономастика України першого тисячоліття нашої ери. Київ: Наукова думка, 1992.

**2.** Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыклапедыя. – Мінск, 1993. – 704 с.

**3.** Археология УССР. – Т. 1. – Київ: Наукова думка, 1985.

**4.** Археология УССР. Т. – 2. – Київ: Наукова думка, 1986.

**5.** Атлас українскої мови. Середня Наддніпрянщина, Полісся і суміжні землі. Т. – 1. – Київ: Наукова думка, 1984.

**6.** Березанская С. С. Средний период бронзового века в Северной Украине. Киев: Наукова думка, 1972. – 271 с.

**7.** Брайчевський М. Ю. Походження Русі. – Київ: Наукова думка, 1968. – 224 с.

**8.** Вербич Святослав. Архаїчна гідронімія Чернігівсько-Сумського Полісся // Волинь-Житомирщина. Історико-філологічний збірник з регіональних проблем. – 22 (І том). Житомир: Вид-во ЖДУ ім. І. Франка, 2010.

**9.** Відейко М. Ю. Шляхами трипільського свиту / Невідома Україна: Наш час, 2008. – 296 с.

**10.** «Говірка села Машеве Чорнобильського району». Ч. 1: Тексти / Укладачі: Ю. І. Бідношия, Л. В. Дика. – 456 с., іл.; Ч. 2. Тексти / Укладачі: Г. В. Воронич, Л.А. Москаленко, Л.Г. Пономар. – 608 с., іл.; Ч. 3. Матеріали до лексичного атласу української мови / Ю. І. Бідношия, В. Г. Воронич, Л. В. Дика, Л. А. Москаленко, Л. Г. Пономар. – 225 с., іл. – Київ: Довіра, 2003.

**11.** Гудзій М. К.Українські інтермедії XVII–XVIII ст. – Київ: Вид-во АН УРСР, 1960.

**12.** Диалектологический атлас русского языка. Фонетика. – Москва: Наука, 1986.

**13.** Дуличенко А. Д. Основы славянской филологии. Том І. Историко-этнографическая и этнолингвистическая проблематика – Opole, 2011. – 526 с. Том II. Лингвистическая проблематика. – 640 с.

**14.** Еременко В. Е. Археологическая карта милоградской культуры // Славяне. Этногенез н этническая история (Междисциплинарные исследования). Межвузовский сборник. – Ленинград, 1989.

**15.** Журавницький Іван (Жоравницький Ян) // Вікіпедія (прагляд 1.06.2015). Хто йдеш мимо, 1575.

**16.** Безпалько О. П., Бойчук М. К., Жовтобрюх М. А., Самійленко С. П., Тараненко І. Й. Історична граматика української мови. – Київ: Радянська школа,1957. – 475 с.

**17.** Ильинская В. А., Тереножкин А. И. Скифия VII–IV вв. до н. э. – Киев: Наукова думка, 1983. – С. 367.

**18.** История первобытного общества. Эпоха первобытной родовой общины. – Москва: Наука, 1985. – 574 с.

**19.** Климчук Ф. Д. К особенности гидронимического ландшафта одной славянской микрозоны // Ученые записки Тартуского государственного университета. – Вып. 579. Вопросы становления и развития языковой системы. – Тарту, 1981.

**20.** Климчук Ф. Д. Древнее племенное деление восточных славян в свете современного диалектного ландшафта // Структура і розвиток українських говорів на сучасному етапі. XV Республіканська діалектологічна нарада: Тези доповідей і повідомлень. – Житомир, 1983.

**21.** Климчук Ф. Д. Этнос и перепись: парадоксы статистики // Ожог родного очага. – Москва: Прогресс, 1990.

**22.** Клімчук Ф. Д. Гомельшчына – прарадзіма этнічных беларусаў (да пастаноўкі пытання) // Гомельшчына: народная духоўная культура. Дыялекты. Тапанімія: Матэрыялы рэгіянальнай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 850-годдзю летапіснага ўпамінання Гомеля. – Гомель, 1992.

**23.** Климчук Ф. Д. К проблеме этногенеза славян // Philologia slavica. К 70-летию академика Н.И. Толстого. – Москва: Наука, 1993.

**24.** Клімчук Ф. Д. Рэфлексы **d, *t* перад этымалагічнымі **e, *i* ў славянскіх гаворках // Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства: Матэрыялы Другой міжнароднай навуковай канферэнцыі. – Віцебск, 1993.

**25.** Клімчук Ф. Д. Праблемы этнагенезу ўсходнеслав/янскіх народаў // Пам’ятки писемності східнослов’янськими мовами XI–XVIII століть. – Київ: Хрещатик, 1995. Вип. 2.

**26.** Клімчук Ф. Д. Беларусы – нашчадкі банцараўцаў // Спадчына. № 1. – Мінск, 1996.

**27.** Клімчук Ф. Д. Да глотагенезу беларусаў // Беларусіка (Albaruthenica). 6. Частка 2. Беларусь паміж Усходам і Захадам. Праблемы міжнацыянальнага, міжрэлігійнага і міжкультурнага

ўзаемадзеяння, дыялогу і сінтэзу. – Мінск: Нацыянальны навукова-асветны цэнтр імя Ф. Скарыны, 1997.

**28.** Климчук Ф. Д. Полесье и этногенез восточнославянских народов // Український діалектологічний збірник. Книга 3. Пам'яті Тетяни Назарової. – Київ: Довіра, 1997.

**29.** Клімчук Ф. Д. Да вытокаў фарміраваньня ўсходнеславянскіх народаў // Kryŭja–Крыўя. – № 1(3). – Менск, 1998.

**30.** Климчук Ф. Д. Диалектные типы Полесья // Слово и культура. Памяти Никиты Ильича Толстого. – Т. 1. – Москва: Индрик, 1998,

**31.** Климчук Ф. Д. Диалектные типы Полесья на общеславянском фоне // Славянские этюды. Сборник к юбилею С.М. Толстой. – Москва: Индрик, 1999.

**32.** Клімчук Ф.Д. Да праблемы Артаніі // Славянский мир на пороге третьего тысячелетия: Материалы Международной научной конференции (Гомель, 15–16 мая 2001 г.). – Гомель, 2001.

**33.** Клімчук Ф. Д. «Спорь» Ираконія Кесарыйскага і Спорава // Гістарычная Брама. Гісторыка-краязнаўчы часопіс. – № 1–2 (19–20). – Бяроза Брэсцкай вобласці, 2002.

**34.** Климчук Ф. Д. Некоторые дискуссионные вопросы средневековой истории Надъясельдья и Погорынья // Palaeoslavica, XII/2004, No 1. Cambridge – Massachusetts [USA].

**35.** Климчук Ф. Д. Отголоски праславянщины в Столинском районе Брестской области // Язык культуры: Семантика и грамматика: К 80-летию со дня рождения академика Никиты Ильича Толстого (1923–1926). – Москва: Индрик, 2004.

**36.** Клімчук Ф. Д. На якой «мове» гаварылі дрыгавічы? // Сучасныя праблемы беларускага мовазнаўства: Матэрыялы навуковай канферэнцыі, прысвечанай 75-годдзю Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі, 2 лістапада – 2004. Мінск: Права і эканоміка, 2004.

**37.** Клімчук Ф. Д. Дзве славянскія дыялектныя зоны // Jezikoslovni zapiski, zv. 13: Merkujev zbornik – Lubljana. – 2007. – № 1–2.

**38.** Клімчук Ф. Д. Адпаведнікі рэлевантных асаблівасцей загародскіх гаворак у дыялектных кантынуумах Украіны і Расіі // Волинь – Житомирщина. Історико-філологічний збірник з регіональних проблем. – 2007. – №16.

**39.** Клімчук Ф. Д. Тэксты са Столінскага раёна // Народныя скарбы. Дыялекталагічны зборнік: Да 80-годдзя А.А. Крывіцкага. – Мінск: ВТАА «Права і эканоміка», 2008.

**40.** Клімчук Ф. Д. Да этнагеезу ўкраінцаў // Діалектна мова: сучасний стан і динаміка в часі. – Київ, 2008.

**41.** Клімчук Ф. Д. Аб адным праславянскім архаізме // Беларуская мова ў культурнай і моўнай прасторы Славіі. Матэрыялы

Міжнароднай навуковай канферэнцыі Мінск, 24–25 лістапада 2009 г. – Мінск: Права і эканоміка, 2009.

**42.** Климчук Фёдор. «Желтые волосы» и этногенез // ГІСТАРЫЧНАЯ БРАМА: Гісторыя і культура Палесся. – 2010. – № 1 (25). Выдае Палескі дзяржаўны універсітэт (г. Пінск, Брэсцкая вобласць).

**43.** Клімчук Ф. Д. Да этнагенезу беларусаў і ўкраінцаў // České vědomí Bělarusi / Чэшскае ўсведамленне Беларусі. Věra Lendělová, Jiří Marvan, Michal Vašíček (eds.). – Univerzita Karlova v Praze, 2013.

**44.** Культура і побут населення України. – Київ: Либідь, 1991. – 232 с. Карта: Історико-етнографічне районування України.

**45.** Крушельницька Л. І. Північне Прикарпаття і Західна Волинь за доби раннього заліза. – Київ, 1976.

**46.** Крушельницька Л. І. Взаємозв'язки населення Прикарпаття і Волині з племенами Східної і Центральної Європи. – Київ, 1985.

**47.** Крывіцкі – Крывіцкі А.А. Наша родная мова: Навукова-папулярны нарыс. – Мінск: Народная асвета, 1967. – 184 с.

**48.** Кухаренко Ю. В. Полесье и его место в процессе этногенеза славян (по материалам археологических исследований) // Полесье (Лингвнстика. Археология. Топонимика). – Москва: Наука, 1968. – С. 34.

**49.** Кухаренко Ю. В. Археология Польши. – Москва: Наука, 1969. – С. 61, 69–70.

**50.** Лексіка Палесся ў прасторы і часе. – Мінск: Навука і тэхніка, 1971. – 214 с.

**51.** Мартынов В. В. Балто-славяно-италийские изоглоссы. Лексическая синонимия / VIII Международный съезд славистов. – Минск: Наука и техника, 1978. – 48 с.

**52.** Мартынов В. В. Язык в пространстве и времени. Москва, 1983. – 109 с.

**53.** Мартинова Г. І. Середньонаддніпрянський діалект. Фонологія і фонетика. – Черкаси, 2003. – 368 с.

**54.** Мельниковская О. Н. Племена Южной Белоруссии в раннем железном веке. – Москва: Наука, 1967. – 196 с.

**55.** Мойсієнко В. М. Віхор // Справа 2. Беларуска-ўкраінскі альманах. – Мінск: «Белпрынт», «Смэлтак», 2015. – 247 с.

**56.** Нидерле Л. Славянские древности. Перевод с чешского. – Москва: Изд-во иностр. лит-ры, 1956. – 451 с.

**57.** Николаев С.Л. Раннее диалектное членение и внешние связи восточнославянских диалектов // ВЯ. – 1944. – № 3.

**58.** Николаев С. Л., Тер-Аванесова А. В., Толстая М. Н. Вокализм полесских говоров в праславянской перспективе // Славянское языкознание: Доклады российской делегации к XV Международному съезду славистов. – Москва, 2013.

**59.** Никончук Н. В. Правобережнополесские говоры в лингвогеографическом освещении : Автореф. дис… докт. филол. наук. – Житомир, 1983. – 48 с.

**60.** Никончук Н. В. Правобережнополесские говоры с лингвогеографической и исторической точек зрения // Полесский этнолингвистическрй сборник. Материалы и исследования. – Москва: Наука, 1983.

**61.** Никончук М. В. Лексичний атлас Правобережного Полісся. – Київ–Житомир, 1994. – 418 с. (200 карт).

**62.** Никончук Микола. Правобережнополіські говірки в лінгвогеографічному висвітлені. – Житомир: Вид-во ім. І. Франка, 2012. – 316 с.

**63.** Півторак Г. Українці: звідки ми і наша мова. Київ: Наукова думка, 1993. – 200 с.

**64.** Поболь Л. Д. Археологические памятники Белоруссии. Железный век. – Минск: Наука и техника, 1983.

**65.** Рыбаков Б. А. Геродотова Скифия. Историко-географическнй анализ. – Москва: Наука, 1979. – 248 с.

**66.** Рыбаков Б. А. Язычество древних славян. – Москва: Наука, 1981.

**67.** Рыбаков Б. А. Киевская Русь и русские княжества XII–XIII вв. – Москва: Наука, 1982.

**68.** Рыбаков Б.А. Язычество древней Руси. – Москва: Наука, 1987.

**69.** Самуйлік Я.Р. Атлас гаворак Выганаўскага Палесся. – Брэст, 2013. – 323 с.

**70.** Свод древнейших письменных известий о славянах. Том I (I–VI вв.). – Москва: Наука, 1991. – 472 с.

**71.** Седов В. В. Славяне Верхнего Поднепровья и Подвинья. Москва: Наука, 1970. – 200 с.

**72.** Седов В.В. Происхождение и ранняя история славян. – Москва: Наука, 1979.

**73.** Седов В. В. Восточные славяне в VI–XIII вв. / Археология СССР. Москва: Наука, 1982. – 328 с.

**74.** Седов В. В. Славяне. Историко-археологическое исследование. – Москва: Языки славянской культуры, 2002. – 622 с.

**75.** Седов В. О диалектном членении древнерусского языка / Древнерусская народность. Историко-археологическое исследование. – Інтэрнэт, прагляд: жнівень 2015.

**76.** Славяне Юго-Восточной Европы в предгосударственный период. – Киев, 1990.

**77.** Степи Европейской части СССР в скифо-сарматское время // Археология СССР. – Москва: Наука, 1989.

**78.** Телегин Д. Я. Иранские гидронимы на Левобережье Днепра и археологические культуры// ВЯ. – 1993. – № 2.

**79.** Тимахович Ю. Н. Персидские цари. – Минск: Беларусь, 1999. – 320 с.

**80.** Толстой Н. И. О лингвистическом изучении Полесья (предисловие редактора) // Полесье (Лингвистика. Археология. Топонимика). – Москва: Наука, 1968.

**81.** Толстые Н. И. и С.М. О задачах этнолингвистического изучения Полесья // Полесский этнолингвистинческий сборник. Материалы и исследования. Москва: Наука, 1983.

**82.** Топоров В. Н., Трубачев О. Н. Лингвистический анализ гидронимов Верхнего Поднепровья. – Москва: Наука, 1962.

**83.** Трубачев О. Н. Названия рек Правобережной Украины. – Москва: Наука, 1968. – 290 с.

**84.** Трубачев О. Н. Этногенез и культура древнейших славян. Лингв. исслед. – Москва: Наука, 1991. – 271 с.

**85.** Трубачев О. Н. INDOARICA в Северном Причерноморье.– Москва: Наука, 1999. – 320 с.

**86.** Туманян Э. Г. Древнеармянский язык. – Москва: Наука, 1971, 448 с.

**87.** Филин Ф. П. Образование языка восточных славян. Москва-Ленинград: Изд-во АН СССР, 1962. – 294 с.

**88.** Филин Ф. П. Древнерусские диалектные зоны и происхождение восточнославянских языков // ВЯ – 1970. – № 5.

**89.** Цветков С. В. Кельты и славяне. – Санкт-Петербург: Русско-Балтийский информационный центр «БЛИЦ», 2005. – 198 с.

**90.** Чарняўскі М. Бронзавы век на тэрыторыі Беларусі. – Мінск: Народная асвета, 1981.

**91.** Эпоха бронзы лесной полосы СССР // Археология СССР. – Москва: Наука, 1987.

**92.** Энеолит СССР / Археология СССР. – Москва: Наука, 1987.

**93.** Kuraszkiewicz. Ruthenica. – Warszawa: PWN, 1985.

**94.** **Lewin** – Lewin Paulina. Intermedia wschodniosłowiańskie XVI–XVIII wieku. Wroclaw–Warszawa–Kraków, 1967.

***Fedir Klimchuk***

***Some Aspects of the Problem of Ukrainian Ethno- and Glottogenetic Studies***

*We will focus on the origin of the Ukrainian ethnos and its language. It is about the ethnic group, not a nation or nationality. The nation is a new phenomenon. The concept of "nation" is understood in different ways. In some cases this concept approaches the notion of "ethnic group", others have been identified with the notion of "citizenship", etc.*

***Key words:*** *ethno- and glottogenetic studies, ethnos, nation, The Ukrainian language*